

# ТЭОРЫЯ, МЕТАДЫКА І АРГАНІЗАЦЫЯ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Я.Д.ГРЫГАРОВІЧ*

## ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНАЯ СУТНАСЦЬ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Сацыякультурная дзейнасць як сацыяльна арыентаваная работа чалавека па выяўленні, захаванні, пашырэнні, асваенні і трансляцыі культурных каштоўнасцей, назапашаных пэўным грамадствам, ці этнасам, ці супольнасцю, распаўсюджваецца ў асноўным на пазавучэбную і пазапрацоўную сферу чалавека, або, як яе называюць, адпачынкавую. Гэта дзейнасць ажыццяўляецца ў вольны час, мае дабравольны характар, адзначаецца свабодай выбару і ініцыятыўнасцю асобы або групы (сацыяльнай, прафесійнай, рэкрэацыйнай і інш.), характарызуецца глыбокай асобаснай накіраванасцю, індывідуаль-насцю, вызначаемай біялагічнымі і сацыяльнымі патрэбнасцямі чалавека, абумоўлена этнічнымі і рэгіянальнымі асаблівасцямі. Суб'ектам гэтай дзейнасці з'яўляецца сам чалавек, бо менавіта ён засвойвае, захоўвае і трансліруе культурныя каштоўнасці свайго народа.

Сацыякультурная дзейнасць з'яўляецца самастойнай падсістэмай сацыялізацыі асобы, сацыяльнага выхавання і развіцця чалавека.

Працэс сацыялізацыі дэтэрмінаваны канкрэтным грамадствам, часам, канкрэтнай культурна-гістарычнай сітуацыяй. Ён прадвызначае ўключэнне чалавека ў пэўны соцыум, асваенне і ўзнаўленне ім сацыяльнага вопыту дадзенага грамадства, прыняцце патрабаванняў, нормаў і прынцыпаў грамадскіх адносін. У працэсе гэтага ўключэння фарміруюцца асноўныя каштоўнасці, арыентацыі, устаноўкі, матывы, перакананні; маральныя, грамадзянскія, эстэтычныя і іншыя якасці асобы, а таксама спосабы і формы сацыякультурнай дзейнасці.

Культура як "цэласная сістэмна арганізаваная сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, створаных чалавецтвам у працэсе яго гістарычнага развіцця" [1, с. 17], пры дапамозе адукацыі і выхавання перадаецца ад пакалення да пакалення, садзейнічае ўключэнню індывіда ў сацыяльнае жыццё, ператвараючы яго такім чынам не толькі ў частку грамадства, але і ў асобу, індывідуальнасць, якая акумулюе гэтыя каштоўнасці і гатова трансліраваць іх наступнаму пакаленню.

Вельмі важна, што, засвойваючы пэўны вопыт, чалавек фарміруе ўласнае “Я”, адрознае ад іншых, але адначасова адэкватнае гісторыка-культурнаму моманту. Як трапна заўважыў вядомы расійскі вучоны М.А.Арыярскі, задача не ў тым, каб чалавек проста назапасіў у сабе ўсе багацці культуры, а ў тым, «каб ён атаясамліваў сваё “Я” са зместам культуры, зліў з яе жыццём сваё жыццё, з яе мэтамі свае мэты і тым самым зрабіў сэнсам сваёй жыццядзейнасці ўсё сапраўды чалавечае ў чалавеку» [2, с. 129]. Гаворка ідзе аб самаідэнтыфікацыі чалавека з культурай сваёй супольнасці, грамадства, народа, аб суадноснасці мэт і сэнсу жыццядзейнасці лепшым культурным здабыткам цывілізацыі.

Спроба разабрацца ў сутнасці паняцця “сацыякультурная дзейнасць” і вызначыць прадмет і ўмовы функцыянавання, зробленая вядомымі расійскімі даследчыкамі Б.С.Ерасавым, В.Д.Лутанскім і Б.А.Цітовым, дазволіла распрацаваць тэхналогію яе рэалізацыі ва ўмовах свабоднай дзейнасці. Аднак працэс назапашвання сацыякультурнага вопыту не абмяжоўваецца дзяцінствам і юнацтвам. У сучасных умовах значнага ўскладнення грамадскіх адносін, з аднаго боку; росту абъёму інфармацыі, якую нядрэнна было б засвоіць з другога; сусветнай глабалізацыі і ўзнікнення новых тыпаў рэальнасці, напрыклад су- светнай “павуціны”, з трэцяга, развіццё і сацыялізацыя асобы практычна працягваюцца ўсё жыццё. Прычым дзяцінства і юнацтва не з’яўляюцца падрыхтоўчымі этапамі да спасціжэння культуры: з самага ранняга ўзросту дзіця не толькі аб’ект, але і суб’ект функцыянавання культуры. Таму эфектыўнасць гэтага працэсу ў многім залежыць ад таго, наколькі ён педагагічна мэтанакіравана арганізаваны, карэктна скіраваны, метадычна прадуманы, наколькі ўплывае на развіццё асобы дзіцяці, фарміраванне яе светапогляду і сацыяльнага вопыту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складанасць працэсу выхавання, яго значная працягласць у часе, варыятыўнасць і разнастайнасць магчымых уздзеянняў, непаўторнасць індывідуаль-ных псіхалагічных асаблівасцей суб’ектаў уздзеяння не могуць быць укладзены хаця і ў прыкладны, але адзіны змест. Арыентацыя на калектыўнае выхаванне класа, групы, аб'яднання звужае магчымасці выхаваўчага ўздзеяння на канкрэтную асобу, не дазваляе знайсці адэкватныя метады і спосабы выхавання.

Магчыма, па гэтай прычыне пачатак развіцця ў Беларусі новай для нас навукі – сацыяльнай педагогікі — супадае з распадам Савецкага Саюза і датуецца канцом васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя. Тэрмін “сацыяльная педагогіка” сустракаецца ў педагагічнай навуцы з Х1Х ст. у працах Адольфа Дыстэрвега, Генрыха Песталоцці і інш. У пачатку ХХ ст. нямецкім філосафам П.Натарпам была выдадзена кніга пад назвай “Сацыяльная педагогіка”, у якой зроблена спроба рэалізаваць сфармуляваную яшчэ Платонам ідэю інтэграцыі выхаваўчых сіл грамадства з мэтай усеагульнага грамадскага выхавання дзяцей і дарослых у рэчышчы ідэалаў дзяржавы, г. зн. выхаванне ў індывіда нарматыўных адносін да грамадства. Першая палова ХХ ст. стала часам актыўнага развіцця сацыяльнай педагогікі як навукі аб сацыяльным выхаванні ў Германіі, Галандыі, Даніі і іншых еўрапейскіх краінах.

Пакутлівыя пошукі шляхоў дэмакратычнага развіцця грамадства, разуменне каштоўнасці чалавечай асобы і неабходнасці яе індывідуальнага развіцця сталі прычынай актыўнага развіцця на пачатку 90-х гадоў ХХ ст. сацыяльнай педагогікі як галіны педагагічных ведаў і прафесійнай дзейнасці ў Беларусі, Расіі, Літве, Латвіі, Эстоніі, на Украіне і іншых посткамуністычных краінах.

Працы расійскіх вучоных В.Г.Бачаровай, А.У.Мудрыка, Ю.А.Стральцова, М.В.Фірсава, вядомага літоўскага вучонага Б.П.Біцінаса, беларускіх педагогаў А.С.Ніканчука, В.Белаенка, А.Д.Грыгор’ева, І.І.Калачовай, І.В.Цімашэнка сталі асновай стварэння тэорыі сацыяльнай педагогікі, ажыццяўлення сацыяльнага выхавання ва ўстановах розных профіляў, і ў першую чаргу ва ўстановах культуры.

Практычна адначасова з распрацоўкай тэарэтычных асноў новай навукі ў Беларусі (Бабруйск, СШ № 16; Мінск, СШ № 165; Драгічын, СШ №1), Літве, Расіі былі створаны так званыя эксперыментальныя пляцоўкі, на якіх апрабоўваліся тэарэтычныя палажэнні і метадычныя напрацоўкі навукоўцаў. Ужо ў 1991 г. у Мінскім інстытуце культуры (цяпер Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры) і Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М.Горкага (цяпер Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка) распачынаецца падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасцях “сацыяльная педагогіка”, а затым “сацыяльная работа” па эксперыментальных вучэбных планах, падрыхтаваных гэтымі ВНУ, а праз восем гадоў – па тыпавых. З увядзеннем тыпавых планаў, а затым Дзяржаўных адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі падрыхтоўку спецыялістаў у гэтай галіне навукі пачынаюць іншыя вышэйшыя школы нашай краіны, у тым ліку і рэгіянальныя.

Вялікая палеміка вучоных аб суадносінах блізкіх спецыяльнасцей са- дзейнічала не толькі высвятленню тэарэтычных пазіцый, але і з'явілася стымулам для стварэння канцэпцыі падрыхтоўкі спецыялістаў па абедзвюх спецыяльнасцях. У адрозненне ад сацыяльнай работы сацыяльная педагогіка асэнсоўвае становішча чалавека ў сістэме сацыякультурных адносін не як “чалавека, маючага патрэбу ў чым-небудзь”, а як чалавека, што навучаецца, homo educandus, г. зн. чалавека, існуючага ў прасторы трансляцыі культурных каштоўнасцей, чалавека, які з'яўляецца ў гэтай прасторы аб’ектам і адначасова суб’ектам культурна-гістарычнага працэсу. Адукацыя ў такім выпадку разглядаецца як працэс, што праходзіць у грамадскіх інстытутах, дзе сацыяльныя нормы, адносіны, каштоўнасці з’яўляюцца важнейшымі патрабаваннямі да асобы, а веды аб навакольным свеце і грамадстве засвойваюцца праз паводзінскія сэнсавыя рэакцыі выхаванца з мэтай падрыхтоўкі яго да сацыяльнага функцыянавання, або, як зазначае М.В.Фірсаў, у гэтым выпадку адбываецца “работа па фарміраванні сацыяльна-неабходных стэрэатыпаў” [3, с. 9]. Інстытуцыяльнымі формамі пры гэтым выступаюць сям’я, соцыум, грамад- ства, установы адукацыі і культуры.

Такім чынам, у шырокім сэнсе сацыяльная педагогіка разглядаецца як тэорыя і практыка сацыяльнага выхавання з мэтай фарміравання нарматыўных сацыяльных паводзін, дапамогі асобе ў засваенні сацыякультурнага вопыту папярэдніх пакаленняў, у падрыхтоўцы да самастойнага камфортнага фун- кцыянавання ў пэўным соцыуме, як дапамога чалавеку інтэгравацца ў грамадства без фатальнай залежнасці ад яго.

Прафесійная дзейнасць сацыяльнага педагога накіравана на гарманізацыю асобасных і грамадскіх адносін праз аказанне дапамогі асобным індывідам, групам людзей і супольнасцям,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія адчуваюць цяжкасці ў сацыяльным фун- кцыянаванні, шляхам абароны, падтрымкі, карэкцыі і рэабілітацыі, а таксама шляхам змен або рэфармавання асобных элементаў сацыяльнай сістэмы. Прычым такая дзейнасць істотна адрозніваецца ад іншых падобных па характары прафесій – настаўніка, псіхолага, урача. Адно з важнейшых адрозненняў — характар адносін паміж педагогам і выхаванцам, ці кліентам, як яго называюць у замежнай педагогіцы. У параўнанні з суб’ект-аб’ектнымі адносінамі, уласцівымі іншым відам “дапамагаючых” чалавеку прафесій, сацыяльны педагог звычайна будуе суб’ект-суб’ектныя адносіны, арыентуючы сваю дапамогу перш за ўсё на актывізацыю самаабаронных патэнцый індывіда або групы.

Сацыякультурная дзейнасць займае вядучае месца ў рабоце сучаснага сацыяльнага педагога. Высвятленне асаблівасцей фарміравання асобы як суб’екта культуры, распрацоўка тэхналогіі арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці як галоўнай сферы далучэння чалавека да свету культуры запатрабавалі дакладнага вызначэння асноўных тэарэтычных палажэнняў, паняційнага апарату, функцый і прынцыпаў рэалізацыі гэтай дзейнасці.

З нешматлікіх спроб сфармуляваць паняцце найбольш канкрэтным і ёмістым нам уяўляецца азначэнне, прапанаванае вядомым прадстаўніком Санкт-Пецярбургскай навуковай школы прыкладной культуралогіі М.А.Арыярскім: “Сацыяльна-культурная дзейнасць – гэта абумоўленая маральна-інтэлектуальнымі матывамі грамадска мэтазгодная дзейнасць па стварэнні, асваенні, захаванні, распаўсюджванні і далейшым развіцці каштоўнасцей культуры” [22, с. 463].

Улічваючы шматзначнасць паняцця, можна дапоўніць яго азначэнне, уключыўшы сюды дзейнасць па вывучэнні, даследаванні, педагагічна мэта- згодным спажыванні, адэкватным успрыманні культурных каштоўнасцей і інш. Аднак, безумоўна, трэба ўдакладніць матывацыю сацыяльнай дзейнасці, узбагаціўшы яе эстэтычнымі матывамі, якія займаюць звычайна ў жыцці чалавека вядучае месца пасля біялагічных.

Вызначаючы сутнасць сацыякультурнай дзейнасці, вядомы філосаф М.С.Каган указвае на счапленне паняццяў “сацыяльны” і “культурны”, якое выклікае неабходнасць больш складанага ўяўлення пра сутнасць чалавека – істоты не толькі біялагічнай, не толькі сацыяльнай, не толькі біясацыяльнай, а хутчэй трохбаковай, біясацыякультурнай [4, с. 119], таму што чалавек – гэта носьбіт, суб’ект і транслятар культуры, у пэўным сэнсе яе вытворнае, суб’ект не толькі прыроднай, але і культурнай дзейнасці.

Правесці мяжу паміж культурнай і сацыяльнай дзейнасцю чалавека даволі цяжка, таму што ўсякая культурная дзейнасць мае сацыяльны аспект і наадварот. Узаемасувязь паняццяў “сацыяльны” і “культурны”, іх непарыўнае адзінства, узаемадапаўняльнасць і падабенства вынікаў дазваляюць гаварыць аб асобай накіраванасці суб’екта сацыякультурнай дзейнасці – спажыванні, асваенні, развіцці, стварэнні культурных каштоўнасцей дзеля і ў імя другіх людзей, наступных пакаленняў, соцыуму, нацыі, грамадства. Гаворка ідзе хутчэй аб суадносінах і аб’ёме гэтых паняццяў у канкрэтнай дзейнасці: у сацыяльнай дамінуюць арганізацыйна-кіруючы і эканамічны аспекты, у культурнай – ідэі, сімвалы, тэорыі, нормы, каштоўнасці, ідэалы – усё, што абазначаецца паняццем “духоўная культура”.

З’яўляючыся пераемнікам тэрміна “культурна-асветніцкая работа”, тэрмін “сацыякультурная дзейнасць” па сутнасці мае прынцыпова іншае значэнне. Культурна-асветніцкая работа як састаўная частка ідэалагічнай работы разглядала чалавека або групу людзей, а часцей савецкі народ, у якасці аб’екта ўздзеянняў дзяржавы і прыналежных ёй грамадскіх аб’яднанняў (камсамола, партыі, прафсаюза) з мэтай выхавання ў чалавеку якасцей грамадзяніна, селяніна, працаўніка. Лічылася, што чалавек, з’яўляючыся шрубкай дзяржаўнай машыны, мае патрэбу ў такім уздзеянні, успрымае і прымае яго, фарміруецца адпаведна ўзору – камуністычнаму ідэалу. Прынцып аб’ект-суб’ектных адносін вызначаў змест культурна-асветніцкай работы, яе методыку і формы арганізацыі.

З атрыманнем суверэнітэту і развіццём дэмакратычных тэндэнцый у грамадстве сфера культуры значна раней за іншыя змяніла арыентацыі, адмовіўшыся ад аб’ектна-суб’ектнай мадэлі на карысць суб’ект-суб’ектнай, па- ставіла ў цэнтр сваёй дзейнасці чалавека як вышэйшую грамадскую каштоўнасць, яго інтарэсы, патрэбнасці, каштоўнасныя арыентацыі, зрабіла яго ўдзельнікам ствральнай культурнай дзейнасці, яе суб’ектам. Дзяржава ў такім выпадку толькі стымулюе самаарганізацыю сацыякультурнай дзейнасці і стварае ўмовы для самаразвіцця культуры шляхам прававой, эканамічнай, арганізацыйнай і іншай падтрымкі. Яна павінна ўзяць на сябе стварэнне адпаведнай сённяшняму дню інфраструктуры сацыякультурнай сферы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спрыяльнага культурнага асяроддзя, умоў для рэалізацыі дамінуючых духоўных і мастацкіх патрэбнасцей чалавека.

Зыходзячы з такой трактоўкі паняцця, сэнс дзейнасці арганізатара сацыякультурнай дзейнасці заключаецца ў стварэнні ўмоў для самарэалізацыі асобы, задавальнення яе пазнавальных, камунікатыўных, эстэтычных, рэкрэацыйных, творчых і іншых патрэбнасцей. Гэта значыць, у адпаведнасці з думкай А.Д.Жаркова, "чалавек служыць адначасова і аб'ектам, і суб'ектам культурна-адпачынкавай дзейнасці, сродкам і вынікам развіцця асобы".

Установы культуры ўсіх формаў уласнасці заклікаsuccessfully накіроўваць свае намаганні на стварэнне, развіццё, распаўсюджванне культурных каштоўнасцей, арганізацыю змястоўных зносін і разумнай рэкрэацыі насельніцтва, адпачынку чалавека і ўзнаўлення яго сіл, "забяспечыць распаўсюджванне духоўна-культурных каштоўнасцей, іх актыўнае, творчае асваенне людзьмі ў сферы вольнага часу з мэтай фарміравання гарманічна развітой, творча актыўнай асобы" [5, с. 21]. Гэта не выключае неабходнасці пазітыўнага ўздзеяння на чалавека і групу з мэтай выхавання ў іх гуманістычнага светапогляду, дэмакратычных ідэалаў, разумення і прытрымлівання агульначалавечых каштоўнасцей і нацыянальных традыцый.

Такім чынам, сацыякультурная дзейнасць – гэта работа самога чалавека па асваенні сацыяльных і культурных каштоўнасцей, а арганізацыя сацыякультурнай дзейнасці – гэта працэс дзейнасці педагога па стварэнні ўмоў для матываванага выбару асобай прадметнай дзейнасці ў залежнасці ад яе інтарэсаў і патрэбнасцей, дзейнасці, якая спрыяе засваенню, захаванню, развіццю і распаўсюджванню сацыяльных і культурных каштоўнасцей.

Карэкціроўка зместу і накіраванасці сацыякультурнай дзейнасці, новая сацыякультурная сітуацыя, значныя мэтамяркуемыя змены ў палітычным і эканамічным жыцці грамадства, развіццё працэсаў гуманізацыі і гуманітарызацыі выклікалі істотную трансфармацыю тэорыі сацыякультурнай дзейнасці.Вядучыя вучоныя маскоўскай і санкт-пецярбургскай школ прыкладной культуралогіі М.А.Арыярскі, Н.К.Бакланава, Г.М.Біржанюк, А.Ф.Валовік, А.Д.Жаркоў, Т.Г.Кісялёва, Ю.Д.Красільнікаў, В.С.Садоўская, Ю.А.Стральцоў, В.М.Чыжыкаў і іншыя сфармулявалі новую парадыгму сацыякультурнай дзейнасці. Яна будуецца на прынцыпах прыярытэту агульначалавечых інтарэсаў над класава-саслоўнымі ў працэсе асваення духоўных і маральных каштоўнасцей; усеагульнай масавай культуратворчасці, самаарганізацыі, самасцвярджэння асобы як дамінуючай прыметы; гуманізацыі зместу і ўсяго выхаваўчага патэнцыялу, іх усёабдымнага падпарадкавання інтарэсам, па- трэбнасцям і ўстаноўкам асобы; дыялектычнага адзінства і пераемнасці культурна-гістарычнага, сацыяльна-педагагічнага і нацыянальна-этнічнага вопыту, традыцый і інавацый; грамадска-дзяржаўнага сукіравання сацыякультурнай дзейнасцю, забеспячэння дэцэнтралізацыі і суверэннасці рэгіянальнай палітыкі ў сацыякультурнай сферы.

Сказанае варта было б дапоўніць звычнымі педагагічнымі прынцыпамі дабравольнасці і даступнасці сацыякультурнай дзейнасці, ініцыятывы і сама- дзейнасці яе суб'ектаў, пераемнасці і паслядоўнасці далучэння чалавека да свету культуры, адзінства інфармацыйна-лагічнага і эмацыянальна-вобразнага ўздзеяння на свядомасць і паводзіны чалавека, дыферэнцыраванага падыходу да асобы і іншымі, што падкрэсліваюць спецыфічныя асаблівасці гэтай важнейшай формы сацыяльнай практыкі.

Сучасная трактоўка прынцыпаў патрабуе значных змен у ідэалогіі культурнай дзейнасці, павароту культурных устаноў да запатрабаванняў канкрэтнай асобы, а не "народных мас", гуманізацыі ўсяго працэсу арганізацыі работы, пераадолення дагматызму, неапраўданай катэгарычнасці ў ацэнках грамадскага жыцця, праяўлення памяркоўнасці, павагі да думкі меншасці, умення слухаць іншых і быць пачутым імі. Сацыякультурныя інстытуты становяцца ў гэтым выпадку носьбітамі і праваднікамі гуманістычных ідэй, захавальнікамі нацыянальнай культуры, народных традыцый, актуалізатарамі нацыянальных формаў традыцыйнай культуры і агульначалавечых каштоўнасцей, стымулятарамі нацыянальнага самавызначэння і самаідэнтыфікацыі чалавека.


*1. Крукоўскі М.І.* Філасофія культуры. Уводзіны ў тэарэтычную культуралогію. — Мн.: Універсітэцкае, 2000. — 192 с.

*2. Ариарский М.А.* Прикладная культурология. — СПб.: Санкт-Петербург. ун-т культуры и искусств, 1999. — 530 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Фирсов М.В.* Введение в теоретические основы социальной работы: (историко-понятийный аспект). — М.: Ин-т практ. психол., 1997. — 192 с.
4. *Каган М.С.* Философия культуры. — СПб.: Петрополис, 1996. — 416 с.
5. *Жарков А.Д.* Технология культурно-досуговой деятельности. — М.: Моск. гос. ун-т культуры и искусств, 1998. — 248 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ